12 АПРЕЛЯ

У КАЖДОГО В ЖИЗНИ ЕСТЬ ДАТА,
ЧТО В ПАМЯТИ ВЕЧНО ЖИВЕТ:
ОДНИ ПОМНЯТ МАЙ В СОРОК ПЯТОМ,
ДРУГИЕ — СЕМНАДЦАТЫЙ ГОД.
А МНЕ ВСПОМИНАЕТСЯ ЯСНЫЙ,
ВЕСЕННИЙ, АПРЕЛЬСКИЙ ДЕНЕК.
В ЭФИРЕ ЗВУЧИТ ГРОМОГЛАСНО:
«РОССИЯ! ГАГАРИН! ВОСТОК!».
Я ПОМНЮ ЭПОХИ НАЧАЛО
И С ГОРДОСТЬЮ ВСЕМ ГОВОРЮ:
«МОЕ ПОКОЛЕНЬЕ ВСТРЕЧАЛО
КОСМИЧЕСКОЙ ЭРЫ ЗАРЮ!».

Вячеслав ВЕРБИЛО,
студент 1 курса матфака.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 14 (562) | Субота, 11 красавіка 1964 г. | Цана 1 кап. | Год выдання XVII-ы

# На маю думку...

## Аб вучэбна-выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў

І. Я. НАВУМЕНКА,
дацэнт кафедры беларускай літаратуры

Відаць, кожны з выкладчыкаў заўважыў, што працаваць са студэнтамі цяпер стала цяжэй. Яшчэ 5—6 гадоў назад мы мелі на філалагічным факультэце больш-менш аднародную масу моладзі. Студэнтамі станавіліся ўчарашнія выпускнікі сярэдніх школ, людзі прыкладна аднаго ўзросту, прыкладна аднолькавага ўзроўню ведаў.

Цяпер маса студэнтаў неаднародная як па свайму жыццёваму вопыту, узросту, так і па адукацыйнаму ўзроўню. І гэта зразумела. Вельмі добра, што да нас прыходзяць людзі з пэўным працоўным стажам, якія ведаюць цану запрацаванаму рублю. Студэнты, якія паслужылі ў арміі, папрацавалі па 3—4 гады на заводах, будоўлях, у калгасах — гэта сённяшняя наша апора на факультэце, здаровы касцяк. Але, відаць, трапляюць да нас людзі, стаж якіх мае фармальны характар. Ёсць студэнты, якія маюць недастатковую працоўную загартоўку. Карацей, кожны нечым адрозніваецца, і гэта трэба мець на ўвазе пры арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы сярод студэнтаў, асабліва сярод першакурснікаў.

Ёсць у нас студэнты, жыццёвыя далягляды якіх вельмі вузкія. Прыехаў, скажам, юнак з эканамічна адсталага калгаса і на ўсё глядзіць праз прызму таго, што ён бачыў дома. У іншых калгасах ён не быў, прамысловыя прадпрыемствы не наведваў. Ён ведае свой інтэрнат і аўдыторыю, дзе слухае лекцыі. Сустракаюцца і такія маладыя людзі, якія самі не змаглі глыбока разабрацца ў сутнасці вялікіх змен, якія адбыліся ў нашай краіне за апошнія дзесяць гадоў, ды ім ніхто са старэйшых не дапамог у гэтым. Адным словам, наш калектыў павінен лічыцца з фактам, што некаторая, невялікая, нават нязначная частка студэнтаў добрай ідэйнай загартоўкі не мае. Таму і не выключана магчымасць, што яны могуць паддавацца ўплыву буржуазнай прапаганды і ідэалогіі, якая прабіваецца да нас праз розныя каналы.

Вельмі вялікая бяда, якая ўласціва зноў жа невялікай частцы студэнтаў, — п'янкі. У нас вучацца людзі, якім па 24—26 гадоў, часам яны, акрамя стыпендыі, маюць іншыя заробкі (ганарары і г. д.). Партыйная, камсамольская, прафсаюзная арганізацыі факультэта, выкладчыкі ўпарта змагаюцца з такім злом, як п'янкі. Ёсць добрыя вынікі, але можна з упэўненасцю сказаць, што мы не мелі б тых хібаў і ганебных выпадкаў у нядаўнім мінулым, каб не сістэматычныя выпіўкі некаторых студэнтаў.

Слабай ідэйна-палітычнай загартоўкай некаторых студэнтаў, частымі іх выпіўкамі можна вытлумачыць і з'яўленне на нашым факультэце кампаніі Іскрыка—Белавуса. Няма сумнення ў тым, што ўсе, хто ўваходзіў у гэтую кампанію, — людзі, у якіх у галаве вецер, людзі з вельмі хісткім, няпэўным светапоглядам. Пра Іскрыка можна сказаць, што гэта чысцейшай вады кар'ерыст. Ён любымі сродкамі хацеў звярнуць на сябе ўвагу, заігрываў са студэнтамі. Вядомы факты, калі Іскрык сам вылучаў сваю кандыдатуру ў склад факультэцкага камсамольскага бюро. Такім жа антыпатычным, хітрым дэмагогам паўстае і Белавус, другі выключаны з універсітэта член гэтай «капэлы». Вартыя накладзенага на іх спагнання — можа, нават залішне мяккага — і астатнія студэнты.

З'яўленне на нашым факультэце такіх дэмагогаў — вельмі павучальны ўрок для партыйнай, камсамольскай арганізацый, для ўсяго калектыву студэнтаў і выкладчыкаў факультэта. Як магло здарыцца, што на працягу значнага часу беспакарана ў інтэрнаце невялікая група п'янствавала, вяла размовы, недастойныя савецкай моладзі? Гэта можна вытлумачыць толькі тым, што, у першую

(Заканчэнне на 2 стар.)

Насустрач канферэнцыі СНТ, прысвечанай ленінскім дням

# У ЭСТОНСКІХ СЯБРОЎ

Разам з групай студэнтаў універсітэта мне пашчаслівілася нядаўна пабываць на студэнцкай навуковай канферэнцыі Тартускага ўніверсітэта. Сёння, напярэдадні нашай канферэнцыі, прысвечанай ленінскім дням, мне хочацца падзяліцца некаторымі ўражаннямі ад гэтай паездкі.

Даўно заўважана, што толькі той можа па-сапраўднаму шчыра і горача любіць іншыя палі і рэкі, песні і звычаі, ганарыцца поспехамі іншых народаў, хто ўсім сэрцам горнецца да роднага краю. А што эстонцы любяць і ганарацца сваёй сацыялістычнай бацькаўшчынай, можна было бачыць па ўсім: і па любві да роднай мовы і культуры; і па беражлівым стаўленні да гісторыі свайго народа, да яго рэвалюцыйных традыцый; і нават па той чысціні, якую можна было бачыць скрозь: на вуліцах горада, ва ўніверсітэцкіх аўдыторыях, у студэнцкіх інтэрнатах; па тых цудоўных нацыянальных стравах, што так цудоўна гатуюць эстонскія сябры.

Менавіта таму з такой шчырасцю тартускія студэнты прынялі нас, дэлегатаў розных вну на студэнцкую навуковую канферэнцыю. На ёй прысутнічалі пасланцы з дванаццаці саюзных рэспублік, трыццаць студэнтаў прыехала са сталіцы Фінляндыі—Хельсінкі.

Усім нам была дадзена магчымасць папрысутнічаць на лекцыях. Я, у прыватнасці, схадзіў на лекцыю па эстонскай літаратуры на 3 курс аддзялення эстонскай мовы і літаратуры. На курсе— 40 чалавек, ёсць хлопцы і дзяўчаты, як на нашым 3 курсе аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Лекцыя была, відаць, цікавая; усе сядзелі ціха, хто канспектаваў, хто запісваў назвы твораў, якія называў выкладчык. Кінулася ў вочы, што заняты былі ўсе пярэднія рады, пуставалі якраз апошнія.

Даклады гасцей на канферэнцыі заслухоўваліся ў першую чаргу і з асаблівай увагай. На заключным, пленарным пасяджэнні ва ўрачыстай абстаноўцы рэктар універсітэта ўручыў усім удзельнікам канферэнцыі пахвальныя граматы, памятныя кнігі і значкі з літарамі «ŭTŭ», што азначае «СНТ».

Вечарам таго ж дня ва ўніверсітэцкім кафэ-клубе гаспадары наладзілі для гасцей баль, на якім прысутнічала 140 чалавек. Спявалі эстонскія народныя песні, песні іншых народаў, шчыра весяліліся. Цікава, што эстонская моладзь, поруч з сучаснымі, любіць і добра танцуе народныя танцы.

Пасля канферэнцыі быў наладжаны выезд за 50 кіламетраў ад Тарту, у студэнцкі спартыўна-аздараўленчы лагер. Спецыяльна для гасцей быў дадзены канцэрт мастацкай самадзейнасці.

Уладзімір ЯНУКОВІЧ,
студэнт 3 курса аддз. беларускай мовы і літаратуры.

# 15 КРАСАВІКА—ДЗЕНЬ СВАБОДЫ АФРЫКІ

*15 красавіка — Дзень свабоды Афрыкі. На савецкай зямлі сустракаюць свае свята афрыканскія студэнты, што навучаюцца у нашым універсітэце. Ад усёй душы віншуем іх з Днём свабоды Афрыкі.*

*Даём слова афрыканскім студэнтам.*

### БЕН АРТУР

(студэнт з Ганы).

Мая радзіма Гана — багатая краіна. Какао, алюміній, золата, будаўнічы лес — прадметы экспарту Ганы. Вывозіцца таксама шмат садавіны. Умовы жыцця ў Гане значна налепшыліся: адукацыя і медыцынскае абслугоўванне (акрамя харчавання ў бальніцах) у нас бясплатнае, пенсійнае забеспячэнне таксама высокае.

Наш народ і ўрад ставяцца да Краіны Саветаў, як да самага лепшага сябра. Гана выкарыстоўвае вопыт Савецкага Саюза ва ўздыме сваёй эканомікі. У прыватнасці, у Гане будзе пабудавана самая буйная ў Афрыцы электрастанцыя.

### МАСУДЗІ АКІДА

(студэнт з Занзібара).

Я прыехаў у Савецкі Саюз, каб атрымаць вышэйшую медыцынскую адукацыю. Разам са мной прыехала Муанапілі Махмоуд — адзіная афрыканская дзяўчына, якая навучаецца ў БДУ. Зараз мы вывучаем рускую мову на падрыхтоўчым факультэце. Мінск нам вельмі спадабаўся, мы ўжо да яго прывыклі і адчуваем тут сябе, як дома.

Наша краіна атрымала незалежнасць у снежні мінулага года. Яна знаходзілася пад каланіяльным прыгнётам арабаў з Амана і англічан. Праз месяц пасля аб'яўлення незалежнасці на Занзібары адбылася рэвалюцыя. Народ прагнаў з вострава султана і іншых эксплуататараў і цяпер будуе новае жыццё пад кіраўніцтвам прэзідэнта А. А. Каруме. З дапамогай краін сацыялістычнага лагера, асабліва Савецкага Саюза, Занзібар хуткімі тэмпамі развівае сваю эканоміку. І за гэта насельніцтва Занзібара вельмі ўдзячна.

У Дзень свабоды Афрыкі я вітаю маладыя афрыканскія рэспублікі, якія атрымалі нацыянальную свабоду і незалежнасць.

### ЛАМІН КУРАНЬ

(студэнт з Гамбіі).

Я хачу пазнаёміць чытачоў газеты са сваёй краінай. Гамбія раскінулася на заходнім беразе Атлантычнага акіяна. Вузкай паласой цягнецца яна ўздоўж ракі, якая мае ў шырыню ад 3 да 12 кіламетраў. Клімат у Гамбіі — адзін з лепшых у заходняй частцы Афрыкі: субтрапічны, з з прахалодным і гарачым сезонамі. Са снежня да канца красавіка стаіць сухое надвор'е. Колькасць ападкаў не перавышае 45 дзюймаў.

Гамбія — сельскагаспадарчая краіна. Арахісы, пальмавыя арэхі—асноўныя прадукты экспарту і спажывання. Культывуюцца рыс, садавіна, гародніна.

4 кастрычніка 1963 г. Гамбія атрымала незалежнасць. Гэта паказвае, што Гамбія пачала адыгрываць раўнапраўную ролю сярод незалежных краін Афрыкі. Дапамога, якую аказвае Савецкі Саюз слабаразвітым краінам, высока ацэнена народамі Афрыкі. Яна азначае новую эпоху ў развіцці адносін паміж Краінай Саветаў і дзяржавамі Афрыкі і ва ўмацаванні міру ва ўсім свеце.

Няхай жыве мір, дружба, свабода!



*На падрыхтоўчым факультэце нашага ўніверсітэта вывучаюць рускую мову студэнты з Занзібара, Нігера, Гамбіі, Ганы, Кеніі, Танганьікі і іншых краін Афрыкі. На здымку: група афрыканскіх студэнтаў (злева направа) Ібрагім Маман, Ламін Курань, Артур Стэфард, Муанапілі Махмоуд, Джорж Ачыла, Альфонс Бутэра, Лакі Сітоле, Роберт Кейге, Дамінік Муджахузі.* Фота У. БУДАЯ.

### РОБЕРТ КЕЙГЕ

(студэнт з Кеніі).

Мы сардэчна вітаем усе дзяржавы Афрыкі, якія вызваліліся ад каланіяльнага прыгнёту, з Днём свабоды Афрыкі! Удзячныя мы іншым краінам свету, якія дапамагаюць нам у барацьбе супраць імперыялізму.

Кенія, мая радзіма, адна з былых каланіяльных краін, што не так даўно атрымалі сваю нацыянальную свабоду і незалежнасць. Некалькі дзесяткаў гадоў наш народ пакутаваў ад англійскага каланіяльнага прыгнёту, эксплуатацыі, голаду, ад поўнай адсутнасці ўмоў для жыцця. Усё гэта выклікала наш народ да нацыянальна-вызваленчай вайны. Кенія атрымала незалежнасць.

Кенійская нацыянальная партыя, якая кіруе цяпер нашым народам, будуе новае жыццё. Адным з праяўленняў яе клопатаў аб развіцці нацыянальнай эканомікі і культуры з'яўляецца той факт, што з Кеніі ў Савецкі Саюз прыехала група студэнтаў, якія вучацца тут і мараць аб тым, што кенійскі народ пабудуе новае жыццё. Сваёй старраннай вучобай яны ўносяць пасільны ўклад у гэтую справу.

Мы аддаём даніну павагі і ўдзячнасці савецкаму народу, які імкнецца захаваць мір на зямлі, дапамагае многім краінам свету ў галіне эканомікі і адукацыі.

Афрыка змагаецца. Афрыка пераможа!

(Пачатак на 1 стар.)

# На маю думку...

чаргу, паказалі сваю слабасць студэнцкія грамадскія арганізацыі. Для камсамольцаў і камуністаў 5 курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры не было сакрэтам, што Іскрык і Белавус— дэмагогі, што наогул іх адносіны да лекцый, да выкладчыкаў ненармальныя, што гэтыя людзі даўно заслугоўваюць таго, каб іх паводзіны былі абмеркаваны ў калектыве. Справе Іскрыка, Белавуса і да іх падобных мы прысвяцілі нямала сходаў, нарад, пасяджэнняў Вучонага савета, але мы не маем права забыць гэты ўрок. Трэба зрабіць пэўныя вывады, перабудаваць выхаваўчую работу сярод студэнтаў.

Мы, выкладчыкі факультэта, добра ведаем, што асноўная маса студэнтаў — людзі высокай ідэйнай загартоўкі, якія выразна бачаць сваю жыццёную задачу: набірацца ведаў, пашыраць кругагляд тут, у сценах універсітэта, каб потым актыўна ўдзельнічаць у будаўніцтве камуністычнага грамадства. За дзесяць гадоў маёй выкладчыцкай працы я не памятаю выпадку, каб які-небудзь дырэктар школы ці загадчык раяна паскардзіўся, што філфак пасылае на працу дрэнна падрыхтаваных спецыялістаў.

Сёлета мы вельмі хораша правялі на пятых курсах дзень апошняга званка, і гэта было сапраўднае свята студэнтаў і выкладчыкаў. Добрыя, у цэлым, вынікі дала зімовая экзаменацыйная сесія. Размеркаванне выпускнікоў таксама прайшло добра, але нам трэба змагацца, каб як мага менш выпускнікоў заставалася ў Мінску.

За апошні час узмацнілася і стала больш разнастайнай палітыка-выхаваўчая работа. Сурова калектыў асудзіў факты недысцыплінаванасці і амаральных паводзін, якія мелі месца ў апошні час у інтэрнаце. Гэта ўсё добра, і ім мы законна ганарымся.

Але мы не павінны закрываць вочы і на пралікі. Нам трэба дамагчыся рэзкага паляпшэння дзейнасці камсамольскай арганізацыі факультэта, яна павінна больш умешвацца ў пытанні вучобы, сістэматычна і мэтанакіравана весці выхаваўчую работу ў інтэрнатах, у групах.

Многае залежыць і ад выкладчыкаў. Асноўны недахоп, які нам трэба ліквідаваць, — фармалізм. Мерапрыемстваў, што праводзяцца цяпер сярод студэнтаў, нямала. Карысць прыносяць і сходы, і дыспуты, і культпаходы, і вечары. Але пакуль што мы не дамагліся —і гэта самае галоўнае,—каб ведаць кожнага студэнта, ведаць яго запатрабаванні, сумненні і пошукі. Кожны выкладчык павінен стаць добрым таварышам, духоўным дарадчыкам для студэнта. У сваёй палітыка-выхаваўчай рабоце мы кіруемся і павінны кіравацца рашэннямі чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС. Непасрэдныя адносіны да нашай работы маюць і рашэнні студзеньскага і лютаўскага Пленумаў ЦК партыі. Я маю на ўвазе патрабаванні партыі кіраваць дручанай справай канкрэтна, ведаць кожнага свайго падначаленага. Мы «вырошчваем» людзей, фармуем духоўнае і маральнае аблічча, іх светапогляд, іх адносіны да жыцця. Нам нельга забываць, што нашы сённяшнія выхаванцы — гэта наша змена.

А чаго хаваць — большасць з нас, выкладчыкаў, адчувае сябе на факультэце, галоўным чынам, лектарамі. Вядома, лекцыя — вялікая справа, і ў лепшых нашых выкладчыкаў яна выконвае сваю вялікую выхаваўчую ролю. Таму павышаць якасць лекцыі, шырэй практыкаваць узаемнае наведванне і абмеркаванне, дамагацца высокага выхаваўчага іх уздзеяння — наша асноўная задача. Тым не менш патрэбна пашыраць і іншыя віды сувязі выкладчыкаў са студэнтамі. Мы павінны дамагацца таго, каб студэнт ішоў да выкладчыка з адкрытай душой са сваімі сумненнямі, з пытаннямі, якія ён сам не можа вырашыць. Толькі ў такім выпадку будзе забяспечаны поспех.

Партыйнае бюро нашага факультэта стварыла спецыяльную камісію, каб праверыць, як удзельнічаюць кафедры і нашы выкладчыкі ў палітыка-выхаваўчай рабоце сярод студэнтаў. Выявілася, што кафедры рускай і беларускай мовы прымаюць пакуль недастатковы ўдзел у гэтым.

Вельмі карыснымі, у сэнсе выхавання, будуць больш частыя экскурсіі, паездкі студэнтаў разам з выкладчыкамі, наведванне выкладчыкамі інтэрнатаў і проста сяброўскія гутаркі са студэнтамі. Усё гэта зблізкае па-чалавечаму, гэта па-сапраўднаму педагагічна.

Нам трэба дамагчыся, каб студэнты кожнай групы пабывалі на буйнейшых заводах Мінска, глыбей вывучалі жыццё.

На філалагічны факультэт штогод паступае многа літаратурнай моладзі, людзей, якія мараць стаць паэтамі, пісьменнікамі. Так было дагэтуль, так будзе і надалей. Надрукаваўшы два-тры вершы, некаторыя з гэтых маладых людзей з залішняй самаўпэўненасцю лічаць сябе закончанымі талентамі, пагардліва ставяцца да сваіх таварышаў, да лекцый і выкладчыкаў. Нам трэба гэта мець на ўвазе, цярпліва выхоўваць студэнтаў, не робячы ніякіх скідак на іх «літаратурныя» заслугі. Тым болей, што ў нас ёсць каму весці гэтую работу. На факультэце працуюць вядомы паэт Ніл Гілевіч, паэт Алег Лойка, прызнаныя літаратары Міхась Ларчанка, Фёдар Куляшоў, Сцяпан Александровіч. Наогул, перад намі стаіць праблема павышэння патрабавальнасці да студэнтаў. І тут павінен быць больш-менш агульны для ўсіх выкладчыкаў падыход. А то атрымоўваецца, што адзін залішне добры, а другі, наадварот, залішне «жорсткі».

Да таго ж, трэба звярнуцца з просьбай да выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін, што працуюць на факультэце. Яны таксама павінны больш увагі ўдзяляць выхаванню студэнтаў, адчуваць сябе не гасцямі.

Я спыніўся толькі на некаторых наспеўшых праблемах вучэбна-выхаваўчай работы са студэнтамі. На маю думку, іх своечасовае вырашэнне дапаможа палепшыць падрыхтоўку ідэйна загартаваных, высокакваліфікаваных спецыялістаў, актыўных будаўнікоў камунізма.

## Галоўнае ў жыцці— сэрцам не старэць

Прыгожыя роўныя літары выстраіліся на лістку, што вырван са школьнага сшытка. «Добры дзень, дарагі татачка! Як ты жывеш? Я вучуся добра, а як ты здаеш свае экзамены? Жадаем поспеху табе я і мама...» Колькі хваляванняў і радасці, клопатаў і трывогі ў гэтых радках першакласніка! Ён ганарыцца, што ўжо сам умее пісаць пісьмо, пісьмо да таты. Хвалюецца і бацька. Чакае сустрэчы з сынам.

У таты гарачая пара. Апошняя сесія шостага курса біялагічнага факультэта. Не будзе сорамна Аляксею Яфімавічу Саковічу перад сынам, ды і перад таварышамі па вучобе. Шэсць гадоў пройдзена побач з імі ў групе батанікаў. Няхай не кожны дзень яны сустракаліся, але ведаюць адзін аднаго і «хварэюць» адзін за ўсіх, усе за аднаго. Цёпла адгукаюцца студэнты пра старасту сваёй групы. Яны ўпэўнены, што і на гэты раз усё будзе добра.

Мэтанакіравана працуе Аляксей Яфімавіч, настойліва ідзе ён да сваёй мэты. Шмат гадоў упартай працы ўкладзена ў ажыццяўленне думкі стаць добрым настаўнікам, выхавацелем моладзі, атрымаць трывалыя веды. А гэта не заўсёды атрымоўвалася, калі Аляксей Яфімавіч пачаў працаваць у Тумашэўскай васьмігадовай школе Глыбоцкага раёна.

«Навука — накрыты стол для ўсіх, быў бы толькі голад...», — гаварыў А. І. Герцэн. Вось гэты голад і прымусіў Саковіча паступіць у 1958 годзе на завочнае аддзяленне біялагічнага факультэта.

Падыходзяць да канца гады карпатлівай працы. Аляксей Яфімавіч непарыўна звязвае вучобу ва ўніверсітэце з непасрэднай настаўніцкай работай, падтрымлівае сувязь з аграномам калгаса імя XXII партз'езду. Сваім энтузіязмам і любоўю да прыроды Аляксей Яфімавіч заразіў і школьнікаў. З вялікім задавальненнем і цікавасцю адгукаюцца вучні на першы ж заклік пайсці на экскурсію або папрацаваць улетку на прышкольным участку. Добра паблукаць з Аляксеем Яфімавічам у полі, дзе пра кожную травінку і кветку можна даведацца столькі цікавага з яго расказаў. Любяць і паважаюць вучні свайго старэйшага гадамі, але юнага сэрцам сябра за тое, што ён дзеліцца з імі ўсім, што ведае сам, дапамагае ім бачыць свет ва ўсёй яго складанасці і прыроднай прыгажосці.

Не за гарамі абарона дыпломных работ. З сардэчнай удзячнасцю адгукаецца Саковіч пра таварышаў, што працуюць ва ўніверсітэцкай і Глыбоцкай раённай бібліятэках, дзе ён заўсёды атрымоўваў дапамогу. Тэму дыпломнай работы Аляксей Яфімавіч Саковіч звязаў з надзённымі задачамі калгаса. «Пустазелле на тэрыторыі калгаса імя XXII партз'езду і барацьба з ім» — перспектыўная і патрэбная для практыкі сельскай гаспадаркі тэма.

Застаецца пажадаць Аляксею Яфімавічу поспехаў у ажыццяўленні пастаўленай задачы. Мы верым у вашы сілы, Аляксей Яфімавіч.

М. ТУРКО.

## У некалькі радкоў

27 журналістаў, якія заканчваюць сёлета вучобу ў нашым універсітэце, атрымалі накіраванні на работу. Як і заўсёды, пераважная большасць выпускнікоў будзе працаваць у раённых, абласных і рэспубліканскіх газетах Беларусі.

* * *

Студэнты і выкладчыкі ўніверсітэта сустрэліся з Героем Савецкага Саюза М. К. Дзевятаевым. «Уцёкі з фашысцкага палону на самалёце з чорнай свастыкай»— так называлася выступленне героя.

* * *

У БДУ адбылася сустрэча студэнтаў і выкладчыкаў з творчымі работнікамі латвійскай кінематаграфіі. У заключэнне сустрэчы ўдзельнікі яе паглядзелі фільм «Іяланта» вытворчасці Рыжскай кінастудыі.

ЛЕОНИД ДАЙНЕКО

* * *

*Лес опять до рассвета*
*Соловьями пропет,*
*В синих сумерках лето*
*Проложило свой след.*
*Ветром звонким и хлёстким,*
*Вымыв каждый листок,*
*Озорные берёзки*
*К нам пришли в городок*
*И стоят, как девчата,*
*В тесный сбившись кружок,*
*Гармонист плутоватый*
*Их улыбкой ожёг:*
*«Что, подружки, сыграть вам?*
*Угодить буду рад».*
*И зелёные платья*
*У казармы шуршат.*
*И, гремя сапогами,*
*Будим ночь мы в лесах.*
*Не беда, что все дамы*
*При гвардейских усах!*
*Не беда, что устали*
*И гармошка одна.*
*Не за танцы медали*
*Получил старшина.*
*А как пляшет геройски,*
*Что в ансамбле—точь-в-точь.*
*Но уходят березки*
*В соловьиную ночь.*
*Тишина над лесами.*
*И под зыбкой листвой*
*Настороженно замер*
*На посту часовой.*



*На здымку: студэнтка 2 курса аддзялення рускай мовы і літаратуры Ніна Станкевіч. Яна актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці, паспяхова вучыцца, карыстаецца сярод сваіх аднакурснікаў вялікім аўтарытэтам.*
Фота студэнта М. КРАСУЦКАГА

## *Я. Кухарчук іграе ў Рызе*

**У Рызе праходзіць паўфінал першынства краіны па шашках. Сярод яго ўдзельнікаў кандыдат у майстры студэнт універсітэта Якаў Кухарчук.**

**(Наш кар.).**

Абмяркоўваем артыкул Б. А. Мельцэра „Хата прыгожая і вугламі“

## Мора радасці і кропля горычы

**Летась мне давялося быць шаферам на камсамольскім вяселлі аднаго з маіх студэнцкіх таварышаў. Да самага ўрачыстага моманту — рэгістрацыі шлюбу ў ЗАГСе—рыхтаваліся доўга і старанна. Нарэшце, калі прыдзірлівыя вочы дзяўчат не знайшлі ў вэлюме маладой ніводнай заганы, а аб канты штаноў маладога можна было парэзаць палец, усе са зразумелым хваляваннем пайшлі туды.**

**Але наш святочны запал крыху апаў: адразу ж нас не зусім ветліва папрасілі пачакаць няпэўны час. Нарэшце, праз хвілін пятнаццаць, немаладая жанчына з абыякавымі вачыма запрасіла ў кабінет, у якім, дарэчы, нікога не было. Пачалося доўгае, маўклівае, нуднае запаўненне дакументаў. Урэшце рэшт «бухгалтэрыя» скончылася. Жанчына з абыякавымі вачыма пачала ўставаць з-за стала і на хаду аднастайным цягучым голасам нешта гаварыць. Мы чулі толькі асобныя словы: «віншую...», «жадаю...» і толькі з кантэксту здагадваліся, што гэта яна віншуе маладых. Затым, уручаючы чырвоную кніжачку, працягнула сваю пульхную руку — спачатку Ёй, потым Яму. Маладыя паціснулі (іменна яны, а не яна!) мяккую, як анучка, пецярню, але ўжо без асаблівага энтузіязму.**

**Дадому мы ішлі з настроем, канчаткова сапсаваным. Узняўся ён толькі за вясельным сталом.**

**Я расказаў гэтую гісторыю зусім не дзеля прыгожага слоўца, не дзеля таго, каб раскрытыкаваць рытуал рэгістрацыі шлюбу.**

**Я хачу, падтрымліваючы выступленне Б. А. Мельцэра, сказаць вось пра што: а ці ўсё ў нас зроблена для таго, каб самыя ўрачыстыя моманты ў студэнцкім (ды і не толькі ў студэнцкім) жыцці, запомніліся чалавеку назаўсёды? Ці не бываюць яны такімі, як гэта «рэгістрацыя»? На жаль, у большасці выпадкаў гэта так. Пачынаючы з такіх «дробязей», як першая лекцыя, уручэнне студэнцкіх білетаў і заліковых кніжак, і канчаючы ўручэннем дыпломаў, — усюды амаль некранутая «цаліна» шэрасці, будзённасці, а то і фармальнасці.**

**Гэтую «цаліну» трэба неадкладна ўзняць! Асабліва хочацца спыніцца на ўручэнні дыпломаў. Па ўрачыстасці, важнасці гэты момант не на шмат уступае апісанаму ў пачатку гэтага артыкула. А як ён у нас праходзіць? У дзень атрымання дыпломаў ля аддзела кадраў — натоўп. Кожны стараецца як хутчэй атрымаць запаветную кніжку. Затым — звычайная «замочка». Добра яшчэ, калі атрыманне супадае з выпускным вечарам, які ўносіць у гэтую справу хоць некаторую арганізаванасць і парадак.**

**Леташні выпуск універсітэта не атрымаў на рукі дыпломаў. Яны будуць уручацца праз год, г. зн. у сёлетнія летнія месяцы. І нам трэба паклапаціцца, каб адбылося гэта як мага больш арганізавана і ўрачыста. Мне здаецца, гэта павінна адбывацца прыблізна так.**

**У газеце (ці іншым шляхам) даецца аб'ява пра час атрымання дыпломаў выпускнікамі пэўнага факультэта. Ва ўпрыгожанай пасвяточнаму актавай зале збіраюцца выпускнікі, прадстаўнікі партыйных і грамадскіх арганізацый універсітэта. Дэкан ці прадстаўнік рэктарата ўручае дыплом, жадае быламу студэнту ўсялякіх поспехаў у жыцці і працы. У адказ малады спецыяліст, які ўжо год папрацаваў, дзякуе ўсім, хто вывеў яго на шырокі жыццёвы шлях, выказвае свае заўвагі і прапановы, якія павінны садзейнічаць паляпшэнню вучэбнага працэсу. У заключэнне дэкан гаворыць традыцыйнае «развітальнае слова».**

**«Сцэнарый» такога свята, безумоўна, можна ў нечым змяняць, але вельмі хацелася б аднаго: няхай атрыманне выпускнікамі дыпломаў стане сапраўдным святам для іх! Няхай у моры радасці не застанецца і кроплі горычы!**

**Аспірант В. РАГОЙША.**

## Дрэнная традыцыя

Артыкул Б. А. Мельцэра выклікаў вялікую цікавасць сярод студэнтаў і выкладчыкаў. Узнятыя ім пытанні абмяркоўваюцца ў аўдыторыях і інтэрнатах, часам выклікаюць гарачыя спрэчкі.

Але, на наш погляд, адно пакуль застаецца ў баку. Размова ідзе пра дрэнныя традыцыі, супраць якіх неабходна змагацца. Да нас, у рэдакцыю, прыйшла група студэнтаў з гістфака. Яны абураліся, што дзверы кабінетаў часта «упрыгожваюцца» рознымі аб'явамі, прычым часта непісьменнымі. У якасці доказу яны прынеслі аб'яву, якую знялі з дзвярэй кабінета гісторыі КПСС. Вось яе змест: «Всвязи стем, что лаборант болен — кабинет работает в одну смену». Унізе хтосьці зусім слушна дадаў: «Не рабіце памылак, лабаранты. Сорамна!».

Сапраўды, недаравальна лабаранту вучэбнага кабінета рабіць такія памылкі. Але справа не толькі ў гэтым. Нельга ператвараць дзверы кабінетаў і аўдыторый у дошкі аб'яў. Гэта дрэнная традыцыя, і ад яе трэба рашуча адказацца.

(Наш кар).

**Рэдактар М. ІОСЬКА.**

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 02167. Тыр. 2000. Зак. 1493.